Псіхічна хворы мужчына атрымаў ад «ваяроў святла» інфармацыю пра Лукашэнку

21.05.2022, 20:40 | 13,620



У Гомелі яго судзілі за абразу.

20 траўня Савецкі раённы суд Гомеля разгледзеў незвычайную справу паводле абвінавачання ў абразе Лукашэнкі. Абвінавачаны хварэе на псіхічны разлад - аднак яго судзілі праз лісты, атрыманыя ад «ваяроў святла з матрыцы» і разасланых у беларускія пракуратуры, паведамляе праваабарончы цэнтр «Вясна».

Справу разглядаў суддзя **Аляксандр Мохараў**.

Абвінавачаны - **Вадзім Фядосаў** - на судзе не прысутнічаў, яго інтарэсы прадстаўляў адвакат адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля.

Сам абвінавачаны знаходзіцца ў псіхіятрычнай лякарні ў Бярозе пасля прымусовага лячэння са снежня 2021 года, бо ў яго псіхічны разлад. Акрамя таго, з 2019 года ён знаходзіцца на ўліку ў наркалагічным дыспансеры наконт алкагалізму.

Вадзім Фядосаў у 2020 годзе быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, у тым ліку за апаганьванне будынкаў і грамадскіх месцаў.

Згодна з абвінаваўчай высновай, у лістападзе 2021 года Фядосаў накіраваў са свайго электроннага адрасу зварот у пракуратуры ўсіх буйных гарадоў, сцвярджаючы, што Лукашэнка з'яўляецца злачынцам і педафілам, прадае наркотыкі і шпігуе імі дзяцей.

Падчас следства Фядосаў пацвердзіў звесткі, якія змяшчаюцца ў лісце. На пытанне, адкуль у яго гэтыя звесткі, сказаў, што ўсе адказы атрымаў ад "ваяроў святла з матрыцы і іншых крыніц, вядомых толькі яму".

На момант учынення злачынства абвінавачаны быў прызнаны псіхічна хворым і няздольным да адказнасці за свае дзеянні па выніках псіхіятрычнай экспэртызы.

З улікам гэтага падчас спрэчак пракурор прапанаваў зняць з абвінавачанага крымінальную адказнасць і пакінуць яго на прымусовым лячэнні ў псіхіятрычным шпіталі пад агульным назіраннем.

Прадстаўнік абвінавачанага і адвакат падтрымалі пракурора, які ў выніку і агучыў суддзі вердыкт.

Тэлефон Фядосава суд пастанавіў канфіскаваць на карысць дзяржавы.

Спампоўвайце і ўсталёўвайце мэсэнджар Telegram на свой смартфон або кампутар, падпісвайцеся (кнопка «Далучыцца») на канал «Хартыя-97».